# 29 красавіка ў НББ пройдзе круглы стол да юбілею Змітрака Бядулі

28.04.2021 19:04

**29 студзеня ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі адбудзецца круглы стол «Беларускі салавей», прымеркаваны да юбілею вядомага паэта і празаіка Змітрака Бядулі (1886–1941). Пра гэта паведаміў намеснік генеральнага дэрэктара НББ Алесь Суша.**




Комплекснае мерапрыемства да юбілею Змітрака Бядулі будзе прадугледжваць:

- прэзентацыю маштабнай віртуальнай экспазіцыі, якая ўпершыню дазваляе пазнаёміцца з самым шырокім комплексам апублікаваных і неапублікаваных раней дакументаў пра жыццё і творчасць пісьменніка з фондаў розных бібліятэк, архіваў і музеяў Беларусі; атрымаць доступ да поўных тэкстаў яго прыжыццёвых і пазнейшых выданняў, літаратуры пра Змітрака Бядулю; пагартаць багацейшую на гэты момант фотагалерэю класіка; паспрабаваць прачытаць пісаныя рукою пісьменніка лісты да вядомых культурных дзеячаў і ўласных сваякоў, а таксама пазнаёміцца з багацейшым адлюстраваннем жыцця і творчасці Бядулі ў выяўленчым і тэатральным мастацтве, ушанаваннем яго ў сучаснай культурнай прасторы Беларусі;
- навуковае пасяджэнне, удзел у якім прымуць навукоўцы з розных гарадоў Беларусі, прадстаўнікі бібліятэк і музеяў, сродкаў масавай інфармацыі;
- сустрэчу са сваякамі і нашчадкамі пісьменніка, у тым ліку жывое спатканне з Яфімам Плаўнікам, сынам Змітрака Бядулі.

Круглы стол пройдзе ўжывую з трансляцыяй на платформе YouTube. Трансляцыя і пазнейшы відэазапіс мерапрыемства будуць даступныя па **спасылцы**.

Пачатак круглага 29 студзеня а 11-й гадзіне ў Прэс-цэнтры Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі (пам. 308).

Навіны Папул
10:47 Балгарыя адчы для беларусаў з 1 ма
10:02 У Еўрасаюзе а сацсеткі выдаляць пр тэрору на працягу гад рашэння суда
09:52 Новыя экасця з'явяцца ў кожным ра Мінска ў бягучым год
09:40 «Белпошта» вы графік работы ў свят і перадсвяточныя дні
09:39 «Манчэстар Ю
УСЕ НАВІН